© Я.І. Клімуць

# КІРАЎШЧЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ

Літаратура Кіраўшчыны мае слаўныя і даўнія традыцыі. Праўда, пакуль Кіраўскі раён не атрымаў свайго ўласнага адміністрацыйнага статуса, то многія культурныя з'явы прыпісваліся іншым рэгіёнам. Зараз вядома, што мястэчка Добасна і фальварак пад такой назвай стаў знакамітай літаратурнай мясцінай. Менавіта тут нарадзіўся ў 1868 годзе Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі). У фальварку бацька будучага пісьменніка працаваў упраўляючым. Вядома, вельмі цяжка прывязваць творчасць пісьменніка да пэўнай мясцовасці, з якой ён развітаўся яшчэ ў дзяцінстве. Тым не менш, ёсць усе падставы сцвярджаць, што асоба мастака ўспрымаецца прадстаўнікамі таго рэгіёна, дзе ён нарадзіўся, зусім інакш, яна істотна ўплывае на станаўленне мясцовых талентаў. З упэўненасцю можна сцвярджаць, што творчасць Ядвігіна Ш. належыць таксама і Кіраўскаму раёну хаця б і ў тым плане, што ў Добасне, пад зоркай славы Ядвігіна Ш. узрасло шмат беларускіх пісьменнікаў.

Імклівае літаратурнае жыццё на Кіраўшчыне пачалося толькі ў XX стагоддзі. Яшчэ ў "Нашай ніве" пачаў друкавацца Яўген (Аўгінь) Зомерфельд. У 1920-я гады ён змяшчаў вершы ў літаратурным дадатку "Вясна" да бабруйскай газеты "Камуніст". Тэматыка вершаў была характэрнай для таго часу: аўтару дужа хацелася бачыць свой край шчаслівым і пераканальна ў гэта верылася. Прыкладам можа служыць верш "Не пужай...", у якім з вялікім аптымізмам сцвярджалася:

*Зажывём мы не гэтак, як сёння,*
*А пад спевы гудкоў і машын.*
*А над гразкім дарогі бяздоннем*
*Ляжа белая цвёрдасць шашы* [Зомерфельд 1929].

Трэба адзначыць, што ў сярэдзіне XX стагоддзя Яўген Зомерфельд быў вядомым краязнаўцам і выкладчыкам роднай мовы. Па яго метадычных распрацоўках працавала не адно пакаленне беларусістаў.

Несумненна, таленавітым быў і Рыгор Бахта (псеўданім Р. Горбах), які паходзіў, відаць, з сялян Бабруйшчыны. Магчыма, у 1920-я гады закончыў педтэхнікум, можа нават магілёўскі. З усіх звестак пэўна толькі тое, што ў другой палове 1920-х гадоў ён выкладаў беларускую мову і літаратуру на Кіраўшчыне і браў самы актыўны творчы ўдзел у працы Бабруйскай філіі "Маладняка". На жаль, акрамя друкаваных твораў, іншых матэрыялаў пра жыццё і працу Р. Бахты адшукаць не ўдалося. Вядома толькі, што ў 1930 годзе ён быў абвінавачаны ў шкодніцкай дзейнасці, пазбаўлены працы ў школе і выключаны з шэрагаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

БелАПП. Пасля гэтага ўладкаваўся на працу на Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, а ў 1932 годзе М. Лынькоў запрасіў яго на працу стыльрэдактара ў Дзяржаўнае выдавецтва, якое ў той час узначальваў. У 1931–1934 гадах Р. Бахта актыўна перакладаў з рускай і ўкраінскай моў. Ёсць меркаванне, што ў 1936 годзе ён збіраўся паехаць у Грузію, каб вывучыць мову і быць перакладчыкам. Аднак дакументаў пра гэта не знойдзена, як і пра далейшы жыццёвы лёс пісьменніка.

У 1920-я гады на Кіраўшчыне была даволі актыўная група маладых літаратараў, якія групаваліся вакол Бабруйскай філіі "Маладняка". Акрамя Я. Зомерфельда і Р. Бахты часта друкаваліся Кастусь Шылаў і Алесь Жукоўскі. Кастусь Шылаў у 1929 годзе ў альманаху "Вясна" апублікаваў вершы "Хутка", "Шлях новых каляін", "Дрома вёскі, пад вечар маўклівай…". Гэтым творам характэрна напружанасць рытму, пэўная імклівасць, захопленасць праявамі жыцця. Пры гэтым паэт не заўсёды звяртаў увагу на рэаліі рэчаіснасці, драматызм сітуацыі. Але гэта было характэрна для маладнякоўцаў, а пазней і для белапаўцаў. Можна прыгадаць вершы цяперашніх класікаў П. Броўкі, А. Куляшова пачатку 1930-х гадоў, у якіх можам знайсці тыя самыя недахопы. Таму ў агульную плынь упісваліся творы К. Шылава, напрыклад, "Хутка":

*І ня раз над морам калосьсяў,*
*Не жалобнаю песьняй жняі, –*
*А вясёлым жывым камсамольлем*
*Адгукнеца сьпеў у гаі* [Шылаў 1929(а)].

Такая агульная ўзнёсласць і апісальнасць характэрна і для верша "Шлях новых каляін":

*А праца рупна йдзе,*
*Мацней куём падмуркі.*
*Тут гаспадар – Рабочы і Селянін.*
*Мільгае кветкай дзень,*
*Старых аснову бурыць,*
*І ў даль гарыць шлях новых каляін* [Шылаў 1929(б)].

Такая ж тэматыка і танальнасць і вершаў А. Жукоўскага з Жылічаў. У творах "Самагубцу", "Крыльле расьце" пачатковец выказвае бурлівую радасць жыцця, упэўненасць у светлую будучыню. Праўда, многія яго разважанні наіўныя, прамалінейныя. Паэт знаходзіцца пад яскравым уплывам верша Янкі Купалы "Арлянятам", але пафас яго перадае спрошчана:

*Эх, браткі!*
*Ды і мы ж арлянятамі*
*пазіраем*
*у далечы вякоў…*
*Дык і мы ж нішчым краты*
*за кратамі,*
*рвём, руйнуем*
*сляды павукоў* [Жукоўскі 1929].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Узнёслымі матывамі прасякнута і яго апавяданне “Шчасце кліча”. Сюжэт твора таксама характэрны для таго часу. Арганізоўваецца калгас у вёсцы, але старая Вулюта катэгарычна адмаўляецца ўступаць, забараняе гэта рабіць і сваёй дачцы Насці, удаве з малым дзіцём. Яе пераконваюць старшыня толькі што створанага калгаса Мікіта, сакратар партячэйкі Конюхаў, настаўнік Высоцкі, аднак беспаспяхова. Толькі пагроза расправіцца з Вулютай праз сельсавет за здзекі з дачкі спыняюць старую, але не пераконваюць яе, як, дарэчы, і чытача. Агітатары гавораць агульныя фразы, не тлумачыцца і пазіцыя Вулюты: адкуль у яе такая непрыязнь да калгаса. Заўвага Конюхава, што гэта вынік нагавораў кулакоў, нічога не тлумачыць. Аўтару не хапіла майстэрства псіхалагічнай распрацоўкі характараў.

На працягу 1930-х гадоў у школах Кіраўскага раёна працаваў Пімен Панчанка (1917–1995). Тут ён дэбютаваў як паэт, выдаў першую паэтычную кнігу “Упэўненасць” (1938), а ў пазнейшы час праблемы рэгіёна знаходзілі адлюстраванне ў паэзіі П. Панчанкі.

Радаслоўныя карані П. Панчанкі ідуць на Ашмяншчыну, адкуль яго бацькі перад першай сусветнай вайной з’ехалі на працу ў Прыбалтыку. У Таліне паэт нарадзіўся, дзяцінства прайшло на Бягомльшчыне, дзе закончыў сямігодку. А працоўную дзейнасць пачаў на Магілёўшчыне. Спачатку вучыўся на падрыхтоўчых курсах пры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, стаў студэнтам аграхімічнага факультэта, але вучобу пакінуў і паехаў працаваць на Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат. “Праз год быў рэкамендаваны на педагагічныя курсы, скончыў іх, і мяне накіравалі загадчыкам Алянскай пачатковай школы Кіраўскага раёна” [Панчанка 1977, с. 188]. Гэта адбылося ў 1934 годзе. Пасля П. Панчанка вучыўся завочна на філалагічным факультэце Мінскага настаўніцкага інстытута і выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Казуліцкай сямігодцы, а потым і ў СШ № 1 г. Кіраўска.

Першыя вершы, як адзначае паэт, ён знішчаў пасля прачытання сябрам і калегам, асобныя былі надрукаваныя ў раённай газеце і рэспубліканскім друку ў 1934 годзе. Так пачаўся літаратурны шлях будучага Народнага паэта Беларусі.

Вершы, напісаныя на Кіраўшчыне, былі характэрныя і для таго часу, і для таленту маладога паэта. Большасць тэмаў ён браў з уласных назіранняў з жыцця даваеннай вёскі, нешта ўспаміналася з дзяцінства, пацверджанае працай новага часу. Вершы перадавалі бадзёры, радасны настрой, захопленасць жыццём, што характэрна для творчага юнацкага ўзросту. Гэтыя пачуцці аж пераліваюцца цераз край у яго творах, што давала падставы пазнейшай крытыцы пісаць пра аднабаковасць адлюстравання калгаснай рэчаіснасці маладым паэтам.

Дз. Бугаёў заўважае адносна першага зборніка вершаў П. Панчанкі: “Аблегчана-аднабаковы падыход да адлюстравання рэчаіснасці ў той ці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іншай меры адчуваецца і ў таленавітых, ярка-маляўнічых творах. Ён, гэты падыход, кладзе на даваенную паэзію П. Панчанкі адбітак ідылічнасці, афарбоўвае гістарычна, вядома, аптымізм панчанкаўскага лірычнага героя ў занадта ружовыя тоны і часта робіць яго павярхоўна-адналінейным і не пазбаўленым той наіўнасці, якая перашкаджае разумець глыбіню і складанасць жыцця" [Бугаёў 1979, с. 121].

Тым не менш, у ранніх вершах П. Панчанку ўдалося стварыць цікавыя вобразы працаўнікоў вёскі: даярак, пастухоў, паляводаў, лесарубаў, увогуле людзей усіх сялянскіх прафесій. Вядома ж, паэт бачыў цяжкасць гэтай працы, калі ўсё рабілася ўручную, але яго захоплівала разам з тым і апантанасць працоўнага чалавека, яго вера ў немагчымасць абыходзіцца без паўсядзённага занятку. Вось як гэта паказана ў вершы "Нараджэнне дня":

*З кароўніка даярка рупна йдзе,*
*Нясе вядро з пахучым сырадоем.*
*Ёй, пэўна, радасна, што ў гэты ясны дзень*
*Каровы шмат далі ўдою.*
*Гляджу я з хваляваннем навакол –*
*Дзень нарадзіўся ясны, працавіты,*
*І славіць хочацца густое малако*
*І гэты лог, туманам апавіты* [Панчанка 1967, с. 23].

Такой харошай узнёсласцю вызначаюцца таксама і вершы "Яблыня", "На пашы", "Зажынкі", "Падсочка", "Выязджалі лесарубы", "Меліяратары", "Адкапаныя зарніцы". Паэту з усімі гэтымі і іншымі працаўнікамі прыходзілася не адзін раз сустракацца, бо настаўнікаў прымушалі хадзіць па вёсках, праводзіць гутаркі, а ў летнія часы і працаваць фізічна. З аднаго боку, гэта дапамагала назапашванню тэмаў, з другога, адбірала і той невялікі вольны час, так патрэбны для творчасці.

Узнёсла-юначае захапленне жыццём уласціва і для твораў грамадзянскага, патрыятычнага накірунку, што найбольш ярка выразілася ў вершы "Радзіме".

Магілёўшчына, і ў найбольшай ступені Кіраўшчына, назаўсёды ўвайшлі ў творчасць П. Панчанкі. Ён падтрымліваў сувязь з былымі калегамі і вучнямі, якім пашанцавала таксама перажыць тую страшэнную вайну. Трагедыю народа ён выявіў у многіх вершах, па-новаму асэнсаваў і шматлікія праблемы адносін да прыроды, якую ён так узнёсла паэтызаваў на пачатку паэтычнага шляху ў зборніках "Маўклівая малітва" (1981), "Крык сойкі" (1976), "Дзе начуе жаваранак"(1983) і інш.

Паэт на ўсё жыццё запомніў працавітых людзей, ім прысвяціў шмат вершаў. З паэтам назаўсёды засталася і іхняя трагедыя часу вайны. Пра гэта сведчаць шматлікія вершы, напрыклад, "Казулічы":

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Не патрэбна слёз і слоў прачулых...*
*У якой траншэі мокнуў я,*
*Як палілі вас,*
*Матруна Булах,*
*Гаспадыня добрая мая?*
*Попел чалавечы доўга стыне,*
*Адлятае ў хмары маладосць...*
*На сцяне журботнай у Хатыні*
*І маіх Казуліч імя ёсць* [Панчанка 1983, с. 16].

Трагедыя народа адбілася і ў цудоўным вершы "Цяжкое партызанскае качэўе...", у якім выяўлены лёсы многіх маладых маці, што траплялі ў блакады, як гэта было і на Кіраўшчыне ў 1943 годзе. Цяжкая справа пераказваць змест лірычных твораў, але ўсё ж сутнасць трэба выкласці. У час блакады "ў глухіх карчэўях хавалася ад карнікаў сяло", там была маці з дзіцём, якое галоднае, бо ў яе прапала малако. Хутка павінна скончыцца блакада, а тут дзіця можа ўсіх выдаць плачам, пад паглядам-просьбай дзяцей "на парозе чорнага вар'яцтва яна была гатова задушыць". І вось:

*Прайшлі гады...*
*Глядзіць на сына з ласкай:*
*Высокі, дужы, і два ўнукі ёсць;*
*Расказвае малым, нібыта казку,*
*Пра партызан, блакаду, маладосць*
*Гатуючы сняданкі і абеды,*
*Перабірае ў памяці гады!*
*І кожны раз жахаецца кабета:*
*"А што, калі б?" – і млее ад жуды* [Панчанка 1983, с. 25].

Вяртанне да перажытага ў маладосці – уласцівасць ці не кожнага паэта. Заўсёды ёсць патрэба па-новаму глянуць на перажытае і зробленае, многае пераасэнсаваць на ўзроўні ўласнага і чужога вопыту. Гэта характэрна і для творчасці П. Панчанкі. Некалі ўхваляў падсочніц і лесарубаў, і зараз сцвярджае, што "любоў да лесу не пагасла", але і многае змянілася, бо паэт заяўляе:

*Раней любіў я леспрамгасы,*
*Цяпер – лясніцтвы* [Панчанка 1983, с. 57].

Найбольш поўна сувязь з мясцінамі і людзьмі часу сваёй маладосці П. Панчанка выразіў у вершы "А час па грыбы мне хадзіць не прыйшоў...":

*А час па грыбы мне хадзіць не прыйшоў,*
*Я веру пранікліваі сойцы.*
*У бор я пайду пасля першых дажджоў,*
*Што высушыць зыркае сонца.*
*А покуль прысядзем на шэры валун,*
*Падумаем аб галоўным.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Забудзем няўдачы, забудзем хвалу*
*І плюнем на высакамоўнасць...*
*Вясковым настаўнікам некалі быў,*
*Вучыў, павучаў і выхоўваў;*
*Свавольнікаў вучняў ты вельмі любіў,*
*Ды толькі вучыў павярхоўна.*
*Самаўпэўненая маладосць,*
*Наіўнае глупства ўсязнайства.*
*Што мудрасць народа вышэйшая ёсць,*
*Крыху пазнавата спазнаў ты.*
*Ён ведае ўсё, і ён бачыць наскрозь,*
*Ацэніць, ці варты чаго ты.*
*А праца жыцця найгалоўная вось,*
*Давай справаздачу за годы!*
*Зрабіўся відушчым ты толькі цяпер:*
*Нам век не вучыць, а вучыцца;*
*Рабіць, памыляцца, ўзнімацца, цярпець,*
*Вучыцца ў бабра і ваўчыцы;*
*Нястомнасці вечнай – у мураша,*
*Зімовай трываласці ў дрэва...*
*Замоўкні ты ныць, трапяткая душа,*
*Табе адпачынку не трэба* [Панчанка 1983, с. 64–65].

З Кіраўшчыны паходзіць і вядомы крытык і літаратуразнаўца Янка Казека. Ён нарадзіўся ў 1915 годзе ў в. Кострычы ў сялянскай сям'і. У 1931 годзе скончыў Любоніцкую сямігодку і паступіў на вячэрняе аддзяленне Бабруйскага лесатэхнікума, працаваў на дрэваапрацоўчым камбінаце. Актыўна выступаў у друку і быў прызначаны на пасаду інструктара-масавіка ў шматтыражную газету "За ўдарныя тэмпы". У 1934 годзе паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педінстытута, які закончыў у 1938 годзе, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Дукорскай сярэдняй школе Пухавіцкага раёна, з 1939 па 1954 гады служыў у арміі, удзельнічаў у баях пад Ельняй і быў паранены, з'яўляўся палітработнікам, выкладаў у ваенных вучэбных установах. Пасля дэмабілізацыі Я. Казека працаваў у газеце "ЛіМ", у Дзяржаўным выдавецтве БССР, з 1967 года ў выдавецтве "Энцыклапедыя", дзе займаў розныя пасады аж да 1991 года, пакуль не выйшаў на пенсію.

Літаратурную творчасць Я. Казека пачаў як публіцыст. У 1934 годзе ў газеце "Камуніст" апублікаваў верш "Сустрэчны план", а ў 1936 годзе – у часопісе "Полымя" апавяданне "Настаўніца". Стала, пачынаючы з 1935 года, выступаў як літаратурны крытык. За час усёй творчасці выдаў зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў "З невычэрпных крыніц" (1958), "Натхненне і майстэрства" (1963), "Голас часу" (1975), "Падарожжа ў маладосць" (1984", літаратуразнаў-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чныя манаграфіі "Беларуская байка" (1960), "Кандрат Крапіва: крытыка-біяграфічны нарыс" (1965), "Кузьма Чорны: старонкі творчасці" (1980).

Ужо ў ранняй творчасці Я. Казеку удалося пазбегнуць вульгарызатарскіх высноў, хоць уплыў часу на яго выступленнях 1930-х гадоў адчуваўся. У пасляваенныя гады Я. Казека нямала зрабіў для пераадолення заганнай з'явы пад назвай "тэорыя бесканфліктнасці". Яго артыкулы вызначаліся вастрынёй пастаноўкі праблемы, аб'ектыўнымі высновамі, глыбокімі назіраннямі над праявамі літаратурнага працэсу. Ён першы даследаваў гісторыю развіцця жанру байкі ў беларускай літаратуры ад XIX стагоддзя да сучаснасці. Да яго мала хто акцэнтаваў увагу на важнасці гэтага жанру ў творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых паэтаў. Навізною вызначаліся яго даследаванні творчасці Кандрата Крапівы і Кузьмы Чорнага, ён акцэнтаваў увагу на тых праблемах, якія не пападалі ў поле зроку даследчыкаў, а шмат што і пераацэньваў. Бачыў у многіх творах новыя аспекты, якія з'яўляюцца актуальнымі і для нашага часу. Але найбольш Я. Казека ўдзяляў увагі магістральным шляхам развіцця беларускай прозы, даследаваў творчасць І. Мележа, І. Шамякіна, І. Навуменкі і інш.

Цікавым пісьменнікам з'яўляецца і Уладзімір Савіцкі (1914–1989). Ён нарадзіўся ў в. Добасна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння школы два гады (1930–1932) працаваў сакратаром сельсавета, у 1937 годзе скончыў Ленінградскі тэкстыльны інстытут, працаваў у Барнавуле, на Смаленскім льнокамбінаце, служыў у войску. З пачатку вайны быў на фронце, у 1944 годзе стаў ваенным журналістам і служыў да 1957 года, пасля жыў у Барысаве.

Раманы і аповесці Ул. Савіцкага пераважна пра вайну. Ён выяўляе драматычныя сітуацыі франтавога жыцця, быту воінаў Савецкай арміі. Вясковым праблемам прысвечаны яго рускамоўныя творы "Не сотвори зла ближнему"(1974), "Ульяна"(1981), "Аленушка из Долгих Нив"(1989). Пісаў Ул. Савіцкі і вершы, выдаў некалькі паэтычных зборнікаў, таксама на рускай мове.

Значны ўнёсак у літаратуру краю зрабіў Мікола Лук'янаў (1924–2004), які нарадзіўся ў в. Лешчанка Кіраўскага раёна, закончыў школу ў 1941 годзе, ваяваў у партызанах, з 1944 года – на фронце, дзе быў цяжка паранены і вярнуўся дадому інвалідам па зроку. Аднак не кінуўся ў адчай, перасіліў бяду і працаваў, спачатку настаўнікам вячэрняй школы на Бабруйскім прадпрыемстве таварыства сляпых, потым узначальваў Магілёўскае абласное таварыства сляпых. Жыццёвы вопыт, праца ў незвычайных абставінах падштурхнулі яго да творчасці. Пачынаў як публіцыст, друкаваўся ў раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах. Першае апавяданне на рускай мове апублікаваў яшчэ на пачатку 1960-х, але сталай пісьменніцкай працай заняўся значна пазней: толькі ў 1981 годзе ў "Магілёўскай праўдзе" было надрукавана яго апавяданне "Пякучы снег" пра перажытае на вайне.

У аўтабіяграфічнай аповесці "І цемра адступіла..." М. Лук'янаў выявіў сутнасць чалавека, які змагаецца з уласнай бядой. Зазначым, што ён сцвярджае годнасць чалавека ў экстрэмальных умовах, і можна сцвярджаць, што яго маральная перамо-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га вызначана і тым, што ён паўсюдна меў падтрымку і ўзаемаразуменне. У аповесці няма разгорнутых батальных сцэн, але трагедыя радавога байца ў ёй, няхай і ў эпізодах, разгортваецца даволі выразна. А далейшы шлях галоўнага героя азначаны моцнай воляй у пераадоленні ўласных пакут. Першы каменьчык у будучым будаванні ўласнага лёсу заклалі яго сябры па няшчасці яшчэ ў шпіталі: Вадзім Фокін, Сяргей Пятроў, узбек Маўлян. Менавіта яны падштурхнулі Паўла да вывучэння мовы пальцаў. Далейшыя стасункі Янкевіча з жыццём ідуць менавіта ў гэтым напрамку. Дзякуючы разуменню і спагадзе нашых людзей, ён не абрынуўся ў прорву, якую падрыхтавала яму наканаванне падзей. Пісьменнік не разгортвае шырокую панараму сацыяльных праблем, але праз невялікія эпізоды паказвае, што ў той пасляваеннай жыццёвай мітусні вельмі добра ўжываліся розныя махляры, і іх трэба было "распрану", і вытрымаць сваю пазіцыю ў іхніх спакуслівых прапановах, каб не страціць сваю годнасць. Яго сябрук Яўген, таксама інвалід вайны, падыходзіць да вырашэння ўласных праблем крыху інакш. Ён лічыць: калі дзяржава пра такіх не клапоціцца, то трэба самім думаць, як выбірацца з ліха. І ў сродках выжывання не надта трэба быць разборлівымі. Ды Павел разумее згубнасць такой пазіцыі і не прымае яе. Менавіта пад маральным уплывам Паўла і Яўген не пайшоў па сумніўным шляху, хоць яго няўрымслівая натура і магла яго туды завесці. У цяжкай жыццёвай сітуацыі Павел вытрымаў, сцвердзіў сябе як грамадзянін і чалавек. Уся аповесць высвечваецца перамогай маральнай чысціні і чалавечнасці.

Другая аповесць "Ягоны боль" іншая па праблематыцы, але ў ёй у цэнтры таксама лёс былога франтавіка. Іван Рыгоравіч Перагуд імкнецца асэнсаваць сваё жыццё, зрабіць з яго нейкія вывады, і хоць у паважлівым узросце нешта перайначыць. Праўда, і ў гэтым лёс аказваецца не надта спагадлівым. Герой прыходзіць да нярадаснай для сябе высновы, што хоць і жыў правільна, але неяк на абочыне жыцця. Усё ў яго вызначаў выпадак як у службовым, так і ў сямейным жыцці. Зараз Іван Рыгоравіч салідны службовец, начальнік цэха завода. Чаму быць незадаволеным уласным становішчам? Але нешта замінае адчуваць сябе ўпэўненым і цэласным у гэтым жыцці. Задумваецца ён над сваім становішчам толькі тады, калі па-сапраўднаму закахаўся ў Алесю, на трыццаць гадоў маладзейшую асобу. Вось тут і паўстаюць тыя спрадвечныя пытанні: ці так жыў і для чаго? Адназначнага адказу Іван Рыгоравіч так і не знаходзіць.

Аповесць быццам пра наш недалёкі час. Але яна ў рэтраспектыўным плане перамяжоўваецца падзеямі ваеннага часу. Яны лагічна ўпісваюцца ў тэкст аповесці. Не ўсе роўныя і сярод былых франтавікоў. Да часу над гэтым Іван Рыгоравіч не задумваецца. Нават згаджаецца дапамагчы свайму сябру маладосці Пятру Ладуцьку ў пацвярджэнні яго ўдзелу ў вайне, хоць мала што пра яго ведаў, бо дарогі іх разышліся рана. Сутнасць Ладуцькі раскрывае яго другі сябрук Васіль Кулага. Як бы адным штрышком пісьменнік адзначае, што чым больш ад нас аддаляецца вайна, тым больш можа з'явіцца ліпавых ветэранаў. У гэтай аповесці інакш ацэнь-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ваецца вайна ўвогуле. У спрэчках з Васілём Кулагам Іван Рыгоравіч спрабуе давесці, што, на жаль, перамога далася вялікай крывёй, і складвалася яна не толькі з пераможных рэляцый. Вайна, па разуменні Івана Рыгоравіча, заўсёды мае антычалавечы характар. І ў гэтым праявілася грамадзянская пазіцыя пісьменніка.

Фінал аповесці застаецца адкрытым. Раптоўная смерць галоўнага героя падштурхоўвае чытача да вырашэння ўсіх абазначаных пытанняў. У гэтым, зрэшты, і заключаецца галоўная сутнасць літаратуры.

Да маладзейшага пакалення належыць Уладзімір Саламаха. Ён нарадзіўся 24 сакавіка 1949 года ў в. Бераснёўка ў сям'і працаўнікоў леспрамгаса. Пасля заканчэння Скачкоўскай сярэдняй школы ў 1966 годзе стаў працаваць карэктарам у раённай газеце “Кіравец”. Служыў у арміі. У 1975 годзе закончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта і пайшоў на пасаду старшага рэдактара Дзяржаўнага камітэта БССР па кінематаграфіі, а ў 1983 годзе стаў загадчыкам аддзела публіцыстыкі і нарыса часопіса “Маладосць”.

У рэспубліканскім друку Ул. Саламаха выступіў у час вучобы ва універсітэце. Гэта былі невялічкія публіцыстычныя артыкулы, нарысы пра лесарубаў. А ў 1977 годзе з'явіліся ў часопісе “Маладосць” першыя апавяданні “Блізкі далёкі бераг”, “Яўменава хата”.

Большасць твораў Ул. Саламахі прысвечана сваім землякам, працаўнікам лесу і зямлі. У гэтым плане ён ідзе за І. Пташнікавым і В. Карамазавым, але адразу трэба адзначыць, што ён ні ў чым не паўтарае сваіх папярэднікаў. Ён піша пра простага чалавека, звычайна абыдзенага ўвагай і начальствам, і проста людзей, але сумленнага, які да апошніх сваіх дзён не адступае ад традыцыйнай народнай сумленнасці. Пісьменнік асуджае жорсткасць і сквапнасць, прыўнесеныя ў сялянскае асяроддзе новымі парадкамі бяздушнага планавання жыцця і дзейнасці. Ён засяроджвае ўвагу на тым, што ў такіх выпадках чалавек як асоба становіцца не патрэбным. А цэніцца маса працаўнікоў, вызначальная сугуччам паслушных робатаў, якія любымі сродкамі павінны выканаць даведзеныя ім планы, хоць сутнасці і патрэбнасці гэтых планаў ніхто не разумее. Расчалавечванне чалавека – так можна было б сфармуляваць гэтую праблему.

У аповесці “Кавылёк – лесавая былінка” Ул. Саламаху ўдалося стварыць вобраз вось такога маленькага непрыкметнага чалавека, але ў асобе якога якраз і канцэнтруецца высокая маральнасць асобы.

Мішка Кавылёк ад прыроды быццам быў горшым за ўсіх: яшчэ ў дзяцінстве ён пакалечыўся. Быў аднавокім. Таму не мог раўняцца з сваімі аднагодкамі. З гэтай нагоды і пражыў у лесарубаўскім пасёлку пастухом, але тут і заслужыў павагу, бо да сваёй справы адносіўся сур'ёзна, прытрымліваўся народнай маралі. Менавіта праз успрыманне Кавылька пісьменнік дае характарыстыку ўсім жыхарам пасёлка, у тым ліку і працаўнікам леспрамгаса. Сусед Кавалька, яшчэ ў сіле мужчына, Іван Сідоркін паспачуваў Кавальку і паспрыяў, каб яго

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўзялі вартаўніком на дзялянку, бо па стане здароўя той ужо не мог спраўляцца са статкам. Кавалёк Сідоркіна недалюбліваў, аднак дапамогу прыняў. Зразумеўшы гэта як звычайны добрасуседскі жэст, глыбіннасці задумы ён, відаць, і не імкнуўся адкрыць. Сідоркін жа разлічваў з дапамогай Міцькі Кавалька красці лес, паколькі той павінен быць удзячным Сідоркіну. Калі ж Кавалёк паўстаў на дарозе зладзеяў, то Сідоркін і былы ўчастковы Карнеевіч ідуць на забойства. Кавалёк не загінуў, яго выратавала Кандратаўна. Такі фінал аповесці. Пісьменнік адназначна растаўляе акцэнты: у справе нажывы любымі сродкамі людзі даходзяць да злачынства. Але пісьменнік сцвярджае і іншае: ёсць сумленны малады шафёр Васіль Чубацюк, Кандратаўна і іншыя працаўнікі леспрамгаса і вёскі. За імі будучыня.

У наступных творах пісьменнік імкнуўся зацвердзіць гэтую пазіцыю. У апавяданнях і аповесцях Ул. Саламаха адкрывае нам людзей простых, але і высакародных, якія не могуць пасгупіцца сваім сумленнем. Натуральна, пісьменнік не заўсёды акцэнтуе ўвагу на нейкіх ценевых баках нашага жыцця. Гэта звычайна прачытваецца ў агульнай структуры яго твораў. Прыгадаем яго аповесць “Прывід у скураным крэсле” пра апошнія гады існавання тады агульнай вялікай дзяржавы. Пісьменнік са скрухай піша пра тых людзей, якія набліжалі вялікую імперыю да развалу. Партыйныя камітэты нічога не рабілі, а проста імітавалі сваю бурную дзейнасць, пры тым строга прытрымліваліся карпаратыўных адносін, сачылі, каб у структуру не пранік чужак. Яны абыякавыя да ўсяго, акрамя ўласнага дабрабыту. І гэтыя тыпы нікуды не зніклі. Яны і сёння займаюць пасады.

Аповесці “Расступіся, зямля”, “Перакулены свет” шмат у чым дапаўняюць ранейшыя творы. Пісьменнік пайшоў да заглыблення ў выяўленні ўсіх набалелых праблем жыцця. Зусім натуральна, што ў грамадстве ён убачыў працэсы, што губяць нас і сёння. Сам пісьменнік на творчым уздыме.

Добрую заяўку ў літаратуры зрабілі таксама Віталь Савіцкі (в. Добасна) і Мікола Віняцкі (в. Чыгірынка). Ёсць патэнцыяльныя творчыя сілы ў Кіраўскім раёне, што дае падставы меркаваць пра далейшы літаратурны працэс у гэтым рэгіёне Магілёўшчыны.

### Літаратура

*Бугаёў, Дз.* Талент і праца / Дз. Бугаёў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. – 352 с.

*Жукоўскі, А.* Крылле расце / А. Жукоўскі // Вясна. – 1929. – № 2. – С. 11.

*Зомерфельд, А.* Не пужай… / А. Зомерфельд // Вясна. – 1929. – № 8. – С. 7.

*Панчанка, П.* Дзе начуе жаваранак / П. Панчанка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – 222 с.

*Панчанка, П.* На паэтычным небасхіле / П. Панчанка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1977. – 208 с.

*Панчанка, П.* Размова з наследнікамі / П. Панчанка. – Мінск: Беларусь, 1967. – 209 с.

*Шылаў, К.* Хутка / К. Шылаў // Вясна. – 1929 (а). – № 3. – С. 16.

*Шылаў, К.* Шлях новых каляін / К. Шылаў // Вясна. – 1929 (б). – № 8. – С. 14.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова